ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1980 г.
15 МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 18 (1282)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

## ПАЗЫЎНЫЯ ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА

# РАЎНЕННЕ НА ПРАВЫ ФЛАНГ

ХТО З НАС не ведае слоў паэта:

Юноше, обдумывающему,
сделать бы жизнь с кого? —
советую: делай ее
с товарища Дзержинского.

Для нас, юнакоў і дзяўчат, байцоў студэнцкага будаўнічага атрада «Кастрычнік», гэтыя словы гучаць неяк асабліва значна і ўрачыста. Справа ў тым, што Фелікс Эдмундавіч Дзяржынскі з'яўляецца ганаровым байцом атрада вось ужо трэці год. З самага пачатку існавання нашага атрада мы аднадушна вырашылі як мага лепей пазнаёміцца з жыццём і рэвалюцыйнай дзейнасцю нашага ганаровага байца. І гэта не было фармальнасцю. З першага нумара насценнай газеты пачалася серыя нарысаў аб Дзяржынскім, якія пісалі амаль усе байцы атрада. Была падрыхтавана і праведзена канферэнцыя па кнізе Ю. Германа «Расказы аб Дзяржынскім», збіраецца ўвесь друкаваны матэрыял аб ім. А зусім нядаўна ўвесь атрад ездзіў на радзіму Ф. Э. Дзяржынскага—у Івянец і Дзяржынава. Гэта была не проста экскурсія. Акрамя наведання помніка і музея, мы правялі суботнік, далі канцэрт у мясцовай школе.

Знаёмства з жыццём цудоўнага, мужнага чалавека прымусіла нас шмат аб чым задумацца, перагледзець некаторыя свае погляды, адносіны да жыцця. Цяпер кожны з нас добра разумее, што мы ў адказе не толькі за добрае імя свайго атрада, але і за гонар чалавека, які стаў на правы фланг.

Для нас Дзяржынскі — не проста герой. Ён наш старэйшы таварыш. Вырашана выконваць за яго дзённае заданне. Наогул мы будзем рабіць усё магчымае, каб яшчэ вышэй узняць славу аб нашай роднай беларускай зямлі, каб на Пскоўшчыне, куды мы едзем, з аднолькавай павагай адносіліся як да ганаровага байца, так і да ўсяго атрада.

**С. БАРОЎСКІ,**
**баец СБА «Кастрычнік».**

# НАВІНЫ БДУ

### 311 СЛУХАЧОЎ

факультэта грамадскіх прафесій атрымалі пасведчанні аб набыцці другой прафесіі. Студэнты розных факультэтаў на працягу года слухалі лекцыі, праводзілі практычныя заняткі, выконвалі заданні, а нядаўна здалі экзамен па выбранай спецыяльнасці. 311 чалавек пасля заканчэння універсітэта не толькі праявяць здольнасці па сваёй асноўнай спецыяльнасці, але змогуць прачытаць змястоўную лекцыю, арганізаваць грамадска-палітычную работу; стануць кіраўнікамі студый мастацкага слова, будуць выкладаць асновы харэаграфіі, змогуць працаваць у якасці спартыўных суддзяў і інструктараў.

(ПРЭС-ЦЭНТР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА).

### АДБЫЛОСЯ ПАСЯДЖЭННЕ

спартыўна-аздараўленчай камісіі прафкома. На ім ішла размова аб рабоце спартыўна-аздараўленчага лагера «Нарач» універсітэта ў гэтым годзе. Лагер будзе працаваць у тры змены. Ужо зараз клапоцяцца аб тым, каб яны прайшлі весела і цікава. Як і ў мінулыя гады, у прафкоме будуць пуцёўкі ў спартыўна-аздараўленчыя лагеры па абмену з іншымі ВНУ краіны. Гэта лагеры Ленінградскага, Вільнюскага, Калінінградскага, Львоўскага, Ерэванскага і іншых універсітэтаў.

(ПРЭС-ЦЭНТР ПРАФКОМА).

### IV УСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС

маладых вучоных і спецыялістаў па грамадскіх навуках, які быў прысвечаны 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, закончыўся.

Лаўрэатамі рэспубліканскага тура сталі А. М. Байчораў (кафедра навуковага камунізму), Ю. Е. Івонін (кафедра гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў), В. В. Сяргеенкава (кафедра гісторыі СССР дасавецкага перыяду), А. Н. Гурко (кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў), А. Е. Дзяменцьева (кафедра педагогікі), Н. П. Дзенісюк (кафедра навуковага камунізму), С. В. Плужнікаў (кафедра гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў), Т. Г. Румянцава (кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў), Л. Г. Цітарэнка (НДА сектара прыкладной сацыялогіі), Н. А. Цыркун (кафедра псіхалогіі).

# ВЫПРАБАВАННЕ ВЕДАЎ

## ФОТАРЭПАРТАЖ



(Глядзіце 2-ю і 3-ю старонкі).

### ТОЛЬКІ ФАКТ

## Навука—вытворчасці

НАШ УНІВЕРСІТЭТ з'яўляецца галоўнай арганізацыяй рэспублікі па даследаванню праблемы «Сацыялогія працы». Рэкамендацыі вучоных-сацыёлагаў укаранёны на 12 буйнейшых прадпрыемствах рэспублікі. Эканамічны эфект ад іх выкарыстання склаў у мінулым годзе больш чым 500 тысяч рублёў.

* *

СЁННЯ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА — буйнейшы цэнтр вынаходніцтваў і адкрыццяў. Тут налічваецца 315 вынаходнікаў і рацыяналізатараў. Многія работы вучоных і студэнтаў універсітэта добра вядомы не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Адна з апошніх — аўтаматызаваная навучальная сістэма «АТНС БДУ» — з вялікім поспехам дэманстравалася ў павільёне «Народная асвета» ВДНГ СССР. Работа супрацоўнікаў кафедры электронна-матэматычных машын прызнана эфектыўным сродкам ажыццяўлення вучэбнага працэсу і падрыхтоўкі студэнтаў па самых разнастайных дысцыплінах.

Галоўны выставачны камітэт ВДНГ СССР адзначыў распрацоўку беларускіх вучоных адной сярэбранай і трыма бронзавымі медалямі.

* *

ВУЧОНЫЯ УНІВЕРСІТЭТА падтрымліваюць цесныя сувязі са сваімі калегамі з краін сацыялістычнай садружнасці. Іх работы дэманстраваліся на міжнародных выстаўках у Польшчы, Балгарыі, Венгрыі, Індыі, Італіі, Англіі.

**Падрыхтаваў А. ЛАЗОЎСКІ.**

## Увага: конкурс!

**РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, МЯСЦКОМ, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА, ПРАФКОМ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА АБ'ЯЎЛЯЮЦЬ КОНКУРС НА ЛЕПШЫЯ ЭСКІЗЫ ЮБІЛЕЙНАГА НАСТОЛЬНАГА МЕДАЛЯ, ЗНАЧКА І ВЫМПЕЛА УНІВЕРСІТЭТА.**

**ЭСКІЗЫ ПРЫМАЮЦЦА Ў КАМІТЭЦЕ КАМСАМОЛА (АЎД. 308) ДА 10 ЧЭРВЕНЯ 1980 ГОДА. ПЕРАМОЖЦАЎ КОНКУРСУ ЧАКАЮЦЬ КАШТОЎНЫЯ ПАДАРУНКІ.**

# ЗНАЙСЦІ СВОЙ ГОЛАС

**ЗАКОНЧЫЎСЯ агульнаўніверсітэцкі агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці, прысвечаны 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Кампетэнтнае журы ўзважыла ўсе «за» і «супраць» і падвяло вынікі.**

**Першае месца заняў механіка-матэматычны факультэт, другое — філалагічны і трэцяе — факультэт журналістыкі. Сваімі ўражаннямі аб конкурсе дзеліцца з нашым карэспандэнтам Л. П. Лазарава — старшыня студэнцкага клуба мастацкай самадзейнасці, член журы:**

— Агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці праходзіў у актавай зале універсітэта. Мэта конкурсу — далейшае развіццё самадзейнай мастацкай творчасці на факультэтах, прапаганда сродкамі мастацтва гістарычнага значэння Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Студэнты падрыхтавалі цікавыя і змястоўныя праграмы. Пры падвядзенні вынікаў конкурсу журы ўлічвала мастацкі і ідэйны ўзровень праграмы, шырыню жанравай палітры, масавасць, рэжысуру канцэрта і, вядома, падпарадкаванне ўмовам правядзення агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці.

Нумары праграмы ацэньваліся па 10-бальнай сістэме. Пры вывядзенні бала за нумар выкрэсліваліся максімальная і мінімальная адзнакі, і гэта дало магчымасць больш аб'ектыўна і якасна ацаніць праграму ў цэлым.

Упершыню ў гэтым годзе пры вывядзенні агульнага бала ўлічвалася колькасць набраных балаў за агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці, за праграму палітычнай песні, за ўдзел студэнтаў ва універсітэцкіх калектывах мастацкай самадзейнасці і за правядзенне дзён факультэта.

Па выніках агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці журы аднадушна прызнала лепшым выступленне механіка-матэматычнага факультэта. Масавасць і сцэнічная культура, высокі мастацкі ўзровень і актуальнасць тэмы — усё гэта садзейнічала таму, што факультэт стаў пераможцам. Гаворачы аб поспехах самадзейных артыстаў мехмата, нельга не адзначыць і той факт, што на факультэце на працягу ўсяго года дзейнічаюць гурткі мастацкай самадзейнасці, актыўны ўдзел прымаюць студэнты ў народных самадзейных калектывах універсітэта.

Цікавым было і выступленне студэнтаў факультэта журналістыкі. Іх праграма была яркай і індывідуальнай, выдзялялася своеасаблівай рэжысурай. Добра выступіла і фальклорная група самадзейных артыстаў філфака. Нядрэнную праграму ў параўнанні з мінулагоднім выступленнем падрыхтавалі студэнты юрыдычнага факультэта.

Але не ўсе факультэты аднесліся сур'ёзна да гэтай вельмі важнай справы. Некаторыя факультэты пачалі падрыхтоўку толькі за месяц да агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці. І заканамерны вынік — нецікавая праграма, нізкі мастацкі і ідэйны ўзровень выступлення. Так атрымалася на фізічным і геаграфічным факультэтах. Думаецца, што гэтыя калектывы зробяць належныя вывады і ў наступным годзе больш увагі аддадуць рабоце культурна-масавай камісіі.

Наступны год — год юбілейны. Універсітэт будзе святкаваць сваё 60-годдзе. І вельмі хацелася б, каб гэта тэма знайшла сваё адлюстраванне ў выступленнях самадзейных артыстаў.

**Г. МІХНАВЕЦ.**

# ВЫПРАБАВАННЕ ВЕДАЎ

**ФОТАРЭПАРТАЖ**





**(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).**

тоеснасць вышэйшай і сярэдняй школы.

І добры дзень, канспекты, кнігі, і вельмі маленькія, непрыкметныя канспекцікі і кніжачкі. Як добра, што вы ёсць, што вы даяце нам усемагутныя веды — ключы ад шматлікіх таямніц прыродазнаўчых і гуманітарных навук. Як добра, што ў нас такая выдатная, папулярная бібліятэка і чытальныя залы.

І з якой асaлодай, з пачуццём выкананага абавязку пакідаеш чытальную залу (яна перапоўнена, на абанеменце патрэбнай кнігі няма з пачатку семестра) і ідзеш у парк, інтэрнат, у госці: пачытаць канспект, часопіс, рэферат.

І яшчэ што добра. Тое, што нашы студэнты нават у самых экстрэмальных умовах (чытай: нічога не ведаў, шпаргалку не дастаў) здаюць усё на добра і выдатна. І ніколі не губляюць пачуцця гумару. Хоць, калі сур'ёзна, сапраўды часам не да смеху.

**НА ЗДЫМКАХ:** І курс, ІІІ група, біяфак. Экзамен па фізіцы здае Валя Гурэцкая, прымае дацэнт І. М. Канашава; Лена Скульбедзіна, чацвёртакурсніца фізфака толькі што атрымала «выдатна» па навуковаму атэізму; ФПМ, ІІІ курс, экзамен па тэорыі верагоднасці, дацэнт Ю. С. Харын і студэнт Павел Канстанцінаў.

Фота і тэкст **Ул. Злобіча.**

**НАШЫ ІНТЭРВ'Ю**

# У ДРУЖБЫ НЯМА МЕЖАЎ

**НЯДАЎНА гасцямі студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна была дэлегацыя Саюза сацыялістычнай нямецкай рабочай моладзі з Федэратыўнай Рэспублікі Германіі.**

**Аб характары СНРМ на ўстаноўчым з'ездзе ў горадзе Эсене было сказана: «СНРМ з'яўляецца марксісцкай арганізацыяй рабочай моладзі, якая заяўляе аб сваёй вернасці ідэям Маркса, Энгельса і Леніна». Ленінскі камсамол і СНРМ звязваюць вузы братэрства, цеснага супрацоўніцтва, якое пастаянна развіваецца. На гэты раз гасцямі нашай краіны былі пераможцы конкурсу на лепшы сацыяльны рэпартаж.**

**У конкурсе, арганізаваным па ініцыятыве прагрэсіўных маладзёжных часопісаў «Элан» і друкаванага органа марксісцкага саюза студэнтаў «Спартак» — «Ротэ блеттэр» («Чырвоныя старонкі») побач з прафесіянальнымі журналістамі ўдзельнічалі рабочыя і служачыя, студэнты сярэдніх і вышэйшых устаноў краіны. Аўтары лепшых публікацый, у якіх закраналіся самыя важныя, актуальныя праблемы, якія хвалююць моладзь ФРГ, удастоены прэміі імя чэшскага рэпарцёра Кіша.**

**Мы папрасілі Розі Крафт, рэдактара маладзёжнага часопіса «Элан» з Дортмунда, расказаць аб формах супрацоўніцтва паміж ВЛКСМ і СНРМ, аб ролі часопіса ў асвятленні гэтага супрацоўніцтва.**

— Саюз нямецкай рабочай моладзі мае сяброўскія сувязі з Ленінскім камсамолам, — гаворыць Розі Крафт. — Нягледзячы на пануючыя ў нашай краіне антыкамунізм і антысаветызм, мы не даём збіць сябе з курса на развіццё і паглыбленне сяброўскіх адносін з моладдзю Краіны Саветаў. Мы не слухаем тых, хто сцвярджае, што калі б СНРМ не падтрымліваў цесных сувязей з Ленінскім камсамолам, у яго былі б вялікія магчымасці ў аказанні ўплыву на моладзь ФРГ. Мы заўсёды кіруемся словамі Эрнста Тэльмана аб тым, што дружба з Савецкім Саюзам з'яўляецца рашаючым крытэрыем для кожнай камуністычнай арганізацыі.

У нашай краіне аб'ектыўная інфармацыя аб СССР практычна адсутнічае. Вядома, не ўсе маладыя людзі, якіх мы прымаем у сваю арганізацыю, са шчырай сімпатыяй адносяцца да савецкай краіны. Таму мы імкнёмся выхоўваць у моладзі пачуццё дружбы да першай у гісторыі сацыялістычнай дзяржавы. Выкарыстоўваем, напрыклад, такую форму работы, як групавыя вечары, дзе расказваем праўду аб краіне Леніна, выпускаем брашуры. Ёсць у нас і спецыяльныя курсы, дзе мы знаёмім з асновамі марксісцка-ленінскай тэорыі.

Нядаўна, калі дэлегацыя ВЛКСМ гасціла ў ФРГ, мы правялі шэраг мерапрыемстваў пад лозунгам «Так жыве моладзь Савецкага Саюза», у час якіх маладыя людзі нашай краіны мелі магчымасць атрымаць сапраўднае ўяўленне аб жыцці савецкага народа.

У часопісе «Элан» мы часта публікуем рэпартажы аб Савецкім Саюзе. На яго старонках выступаюць людзі, якія пабывалі ў вашай краіне. Падобныя матэрыялы, напрыклад, аб Маскоўскім Палацы піянераў і школьнікаў, з'яўляюцца аднымі з самых папулярных і з цікавасцю ўспрымаюцца чытачамі.

Асноўнай мэтай часопіса з'яўляецца асвятленне жыццёва важных для моладзі ФРГ пытанняў, звязаных з правам на працу, на адукацыю. Мы апісваем канкрэтныя сітуацыі, расказваем аб маладых людзях, якія непасрэдна сутыкнуліся з беспрацоўем. Клаус Фарк, Вольфганг Пфляйдэрэр і Андрэас Ройтэр (яны, дарэчы, у ліку пераможцаў конкурсу) у сваіх фотарэпартажах пераканӑуча раскрылі гэтыя праблемы.

У часопісе мы расказваем і аб тым, як уладальнікі прадпрыемстваў парушаюць пэўныя законы. Паказваем на прыкладах, як ушчамляюцца тыя правы, якія моладзь павінна мець. У прыватнасці па закону аб стымуляванні вытворчага навучання, які існуе ў ФРГ.

«Элан» выступае супраць прапагандысцкай шуміхі, якая зараз праводзіцца адміністрацыяй Картэра. Палітыка траўлі ў адносінах СССР, якую зараз праводзіць прэзідэнт ЗША і яго набліжаныя, азначае зварот да часоў халоднай вайны. Але мы не хочам ісці за Картэрам, бо ён ідзе па склізӑкму і небяспечнаму шляху.

— Мы ўдзячны за цёплы прыём, які аказаны нашай дэлегацыі ў Мінску, — уступае ў гутарку Андрэас Ройтэр, член Германскай камуністычнай партыі. — Мы сустрэліся з рабочымі і студэнтамі, пазнаёміліся з іх жыццём, убачылі, які прыгожы ваш горад, пабывалі ў Хатыні.

Наша знаходжанне тут, асабліва зараз, калі людзі многіх капіталістычных краін падвяргаюцца ўзмоцненай ідэалагічнай апрацоўцы, мы выкарыстаем для таго, каб пасля прыезду ў ФРГ праўдзіва расказаць аб першай у свеце сацыялістычнай дзяржаве.

**М. КУРГАНСКІ, Б. ПРАКОПЧЫК, студэнты факультэта журналістыкі.**

**МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ**

# СВЯТА АЛЖЫРСКАЙ МОЛАДЗІ

19 МАЯ моладзь нашай краіны будзе святкаваць дзень нараджэння Нацыянальнага саюза алжырскай моладзі. Ён быў створаны пяць гадоў назад, калі наспела неабходнасць аб'яднаць усе існуючыя дагэтуль маладзёжныя арганізацыі пад кіраўніцтвам Нацыянальнага фронту вызвалення Алжыра. Зараз секцыі гэтага саюза створаны ў гарадах і вёсках. Вызначыліся асноўныя напрамкі дзейнасці саюза — дапамога ў ажыццяўленні партыйнай аграрнай палітыкі, барацьба супраць непісьменнасці, стварэнне на фабрыках і заводах камітэтаў па сацыялістычнаму кіраўніцтву прадпрыемствамі. Грошы, зароблены на суботніках і нядзельніках членамі саюза, пералічваюцца ў Фонд дапамогі народам, якія вядуць барацьбу за сваю незалежнасць.

Паміж Нацыянальным саюзам алжырскай моладзі і іншымі маладзёжнымі арганізацыямі сацыялістычных краін, у тым ліку камсамолам нашай краіны, існуюць трывалыя сувязі. Кожны год мы абменьваемся дэлегацыямі, пераймаем вопыт у сваіх старэйшых сяброў.

У верасні гэтага года адбудзецца VI з'езд нашага саюза. Да яго рыхтуецца ўся алжырская моладзь, якая цвёрда ўпэўнена ў светлым будучым сваёй краіны.

**БЕНУАР НУР ЭДДЗІН, аспірант, член Нацыянальнага саюза алжырскай моладзі.**

# МЫ—НАВАСЁЛЫ!

## РЭПАРТАЖ НАШЫХ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ С. ЛЫСКАЎЦА І А. СТАДУБА З ВУЛІЦЫ ГОЛУБЕВА, 5, КВАТЭРЫ НУМАР...



—МАМАЧКА, глядзі, якая машына! — маленькая дзяўчынка ў чырвоным капялюшыку паказала на велізарны і грымоткі бульдозер, які магутна пыхкаў побач. Ён здаваўся ёй цудам, якое можа нарадзіцца толькі ў казцы. Маці ўзяла дзяўчынку за руку, і яны пайшлі. Пайшлі да новага дзевяціпавярховага дома.

А мы засталіся. Засталіся, каб пазнаёміцца з домам, які быў нядаўна пабудаваны для супрацоўнікаў універсітэта. Засталіся, каб пазнаёміцца з яго жыхарамі. Толькі з чаго пачаць? Сто восем кватэр. Тры пад'езды. Ды і дзень сёння звычайны, працоўны. Мала таго—перадсвяточны.

Паверх пяты. Кватэра нумар 17. Дзверы адчыніла немаладая жанчына. Напэўна, яна зараз адна, і спраў шмат. Гэта сапраўды так. Параіла звярнуцца да каго-небудзь іншага.

Паверх шосты. Кватэра нумар 24.

— Дзень добры! Да вас можна?

— Калі ласка.

Невысокая, прыгожая жанчына запрасіла нас у кватэру. Тры пакоі і кухня — вялікія і сонечныя. У кожнай свой колер: ружовы, блакітны і карычневы.

— Вы мне прабачце, — схамянулася жанчына, заўважыўшы наш зацікаўлены позірк, і ветліва прапанавала:

— Садзіцеся, садзіцеся, калі ласка. Я яшчэ не паспела як след уладкавацца. Толькі атрымала кватэру і праз некалькі дзён адразу паехала да мужа, у ГДР. Ён там зараз на стажыроўцы. Ведаеце, самой зрабіць усё немагчыма. Вернецца—вось тады.

Мы селі. Разгаварыліся. Наша знаёмая, Людміла Васільеўна Каўрыга, расказала, што яе муж, Павел Анатольевіч, супрацоўнік кафедры геаграфіі СССР, вучыцца ў аспірантуры. Расказала аб тым, як сем год яны чакалі кватэры, а жылі раней у Шчомысліцах, у інтэрнаце. За гэты час у іх нарадзіліся два сыны: Саша і Юра. Саша ўжо ходзіць у школу, а Юру няма і года.

З блакітнага пакоя данесліся дзіцячыя галасы. Мы зазірнулі ў яго і ўбачылі двух хлопчыкаў, якія гулялі ў свае, толькі ім зразумелыя гульні.

— Тут паблізу будуюцца дзіцячы сад і школа. Да верасня павінны паспець. Гэта будзе вельмі зручна.

Людміла Васільеўна ўзяла вядро з вадой і падышла да акна.

— Вось бачыце, нават і памыць не паспела. Столькі спраў навокал... Калі перарабіць? Але нічога. Што ні кажыце, а прыемныя гэта клопаты...

Мы развіталіся з ёю на лесвічнай пляцоўцы. Яна запрасіла нас на наваселле. У чэрвені. А можа і раней. Як атрымаецца.

...Ля пад'езда сустрэліся з мужчынам.

— У магазін? — пацікавіліся мы.

— Так. Жонка зараз ва універсітэце, а мне трэба купіць прадукты. Сёння ў мяне другая змена.

— А калі не сакрэт, дзе яна працуе?

— Не, ніякіх сакрэтаў. Яна—старшы лабарант кафедры неарганічнай хіміі. А ў гэтым доме мы ўжо жывём тры тыдні. Як кажуць—старажылы.

— Ну і як?

— Кватэра? Цудоўная! Зараз трэба прывесці ў парадак тэрыторыю каля дома: пасадзіць дрэвы, пабудаваць дзіцячы гарадок. Адным словам, паклапаціцца самім, бо дом гэты — наш. І ўсім, хто жыве ў ім, пашанцавала. У ім нам жыць, у ім нам расціць сваіх дзяцей.



Да дома пад'ехаў грузавік, які прывёз сюды ўсё тое, што робіць кватэру ўтульнай — дываны, тэлевізар, халадзільнік... Напэўна, хтосьці толькі-толькі перасяляецца...

А на дарожцы, якая вядзе да дома, ужо дзеці. Гульня ў іх вельмі важная і сур'ёзная: хто лепш за ўсіх намалюе сонейка ці можа маці з бацькам, а можа — новы дом. Такі, як гэты!



...Мы развіталіся з навасёламі і пакрочылі да аўтобуснага прыпынку. Ужо ў аўтобусе сталі выпадковымі сведкамі такога малюнка. Малады чалавек, відаць, студэнт, гартаў кніжку. «Палітэканомія сацыялізма»... Старонка, другая. «...Права грамадзян на жыллё, упершыню ў свеце запісанае ў нашай Канстытуцыі, падмацоўваецца і шырокай праграмай новага будаўніцтва, і справядлівым размеркаваннем жылой плошчы паміж працоўнымі...». Некалькі радкоў. Усяго некалькі. Са зместам гэтых радкоў мы сёння пазнаёміліся ўвачавідкі. Убачылі, асэнсавалі. З пачуццём гонару і яснай перспектывы. Бо наша краіна робіць усё, каб адна з галоўнейшых задач партыі ў справе павышэння народнага дабрабыту — паляпшэнне жыллёвых умоў насельніцтва — вырашалася заўсёды паспяхова, каб свята наваселля прыходзіла да савецкіх людзей усё часцей. Сёння такое свята ў 106 сем'яў супрацоўнікаў універсітэта. У будучым годзе мы будзем віншаваць з наваселлем нашых супрацоўнікаў у цудоўным новым 120-кватэрным доме, пачнецца будаўніцтва яшчэ аднаго 120-кватэрнага дома. Вось ён, клопат. Гонар. Ясная перспектыва.

**НА ЗДЫМКАХ:** 1. У новы дом з новай мэбляй. 2. Усе заняты сваёй справай. 3. Андрэйка Зуеў з 48-й.

## АДКАЗЫ НА КРАСВОРД

«Листая книг страницы», надрукаваны ў № 16 за 30 красавіка 1980 года.

**По горизонтали:** 6. Фердинанд. 8. Калхас. 9. Райнис. 11. Клеопатра. 12. Дезидерий. 14. «Сид». 16. «Содружество». 20. Дон. 21. Критик. 22. Овидий.

**По вертикали:** 1. Лонгфелло. 2. «Испытание». 3. «Криницы». 4. «Креолка». 5. «Садовод». 6. Фокс. 7. «Двор». 8. Колас. 10. Стивн. 13. Ожешко. 15. Диккенс. 16. «Сами». 17. «Речка». 18. Седов. 19. «Овод». 20. Драйзер.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 04613 Зак. 779.

15 мая 1980 г.



220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19



Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ